

1



2

*Глыбоцкі Троіцкі касцёл: 1 — агульны выгляд; 2 — інтэр'ер.*

**ГЛЫБО́ЦКІ ТРО́ІЦКІ КАСЦЁЛ**, помнік архітэктуры віленскага барока ў г. Глыбокае. Пабудаваны ў 1764—82 з цэглы на месцы папярэдняга храма, у 1902—08 перабудаваны (на 2 ярусы ўзняты вежы, прыбудаваны бакавыя нефы, трансепт, сакрысція). Трохнефавая 2-вежавая базіліка з выцягнутай паўкруглай апсідай. Гал. фасад фланкіруюць шмат'ярусныя вежы, паміж якімі — фігурны атыкавы франтон з валютамі. Тры барочныя франтоны завяршаюць трансепт і алтарную сцяну. Фасады ўпрыгожаны пілястрамі з капітэлямі іанічнага ордэра, раскрапаваны карнізамі, фігурнымі арачнымі праёмамі, сандрыкамі. Сцены храма атынкаваны жоўтай вохрай, дэкар. элементы пабелены. Цэнтр. неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем, бакавыя — крыжовымі. У інтэр'еры 3 драўляныя барочныя алтары, арган у неагатычным стылі. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Касцёл дзейнічае.

*Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ